Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-__ / вуч.

# ГЕАГРАФІЯ ТУРЫЗМУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны
(па напрамках), напрамку спецыяльнасці
1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны
(культурная спадчына і турызм)*

2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені ОСВО 1-23 01 12-2013 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм). Рэгістрацыйны нумар Е 23-1-87/17 вуч. ад 04.07.2017 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Д. В. Герасімёнак,* выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Т. А. Джумантаева,* дырэктар навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік», кандыдат культуралогіі;
*Н. Я. Шалупенка,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 19.04.2017);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Д. В. Герасімёнак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» абумоўлена важнасцю міжнароднага турызму як складаючай часткі інавацыйнага развіцця любой краіны ў доўгатэрміновай перспектыве. Сістэмныя веды ў галіне геаграфіі турызму неабходны ў практычнай дзейнасці менеджараў на прадпрыемствах турыстычнай індустрыі пры выяўленні заканамернасцей фарміравання, асноўных характарыстык і фактараў развіцця турыстычных цэнтраў і зон, іх рэгіянальнай і міжнароднай спецыялізацыі; распрацоўцы турыстычнага раяніравання; аналізе нацыянальных і рэгіянальных асаблівасцей развіцця турызму.

Асноўныя *мэты* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» – фарміраванне ў студэнтаў тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў пра асаблівасці функцыянавання міжнароднага турызму, азнаямленне студэнтаў з рэкрэацыйнымі рэсурсамі, іх турыстычным асваеннем і перспектывамі развіцця турызму ў розных рэгіёнах свету.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны – даць студэнтам сістэмныя веды аб рэкрэацыйных рэсурсах асобных краін і рэгіёнаў свету; навучыць студэнтаў арыентавацца ў спецыялізацыі турыстычных цэнтраў і вызначаць асноўныя турыстычныя зоны асобных краін.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені на спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках).

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-6. Умець фармуляваць задачы па праектаванні, эксплуатацыі і ўдасканаленні (у частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў і турыстычных маршрутаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-15. Праводзіць кансультаванне па пытаннях музейнай справы, арганізацыі турызму і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя этапы развіцця геаграфіі міжнароднага турызму;

– паняцці «геаграфія турызму», «міжнародны турызм», «рэкрэацыйна-турыстычны рэгіён»;

– тыпалогію рэкрэацыйна-турыстычных рэгіёнаў і цэнтраў свету;

– асаблівасці развіцця міжнароднага турызму ў краінах СНД і Балтыі;

*умець*:

– ацэньваць дынаміку турыстычных патокаў;

– улічваць дынамічныя і статыстычныя фактары ў геаграфіі міжнароднага турызму;

– вызначаць патэнцыял рэкрэацыйна-турыстычнай тэрыторыі;

– аналізаваць умовы паспяховага развіцця міжнароднага турызму;

*валодаць*:

– асноўнымі прыёмамі тыпалогіі турыстычных рэгіёнаў свету;

– метадамі ацэнкі дынамікі сусветных турыстычных патокаў;

– спосабамі вызначэння патэнцыялу рэкрэацыйна-турыстычнай тэрыторыі.

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» ўлічваецца яе сувязь з вучэбнымі дысцыплінамі «Гісторыя і арганізацыя турызму», «Сацыякультурныя асновы музейнай і турыстычнай дзейнасці» і іншымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па напрамку падрыхтоўкі «культурная спадчына і турызм».

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камуні-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» прадугледжана 108 гадзін, з якіх 64 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 38 гадзін, семінарскія заняткі – 26 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Тэма 1. Уводзіны*

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму». Асноўны паняційна-тэрміналагічны апарат дысцыпліны. Сацыяльна-эканамічныя і фізіка-геаграфічныя фактары развіцця міжнароднага турызму.

## Раздзел I. Тэарэтычныя і метадалагічныя асновы геаграфіі турызму

*Тэма 2. Класіфікацыя відаў і форм турызму і фактары іх развіцця*

Класіфікацыя відаў турызму па мэце падарожжаў: рэкрэацыйны, экскурсійны, навуковы, спартыўны, рэлігійны, бізнес-турызм і інш., іх характарыстыка. Класіфікацыі, якія характарызуюць асаблівасці суб’ектаў турызму па іх узросце, складзе групы (індывідуальны, сямейны, групавы), сацыяльна-эканамічным статусе, асноўнаму занятку падчас адпачынку. Іншыя класіфікацыі (выкарыстоўваемы транспарт, сезоннасць і г. д.).

*Тэма 3. Геаграфія міжнародных турыстычных патокаў і метады іх вывучэння. Структура сусветнага турыстычнага рынку*

Развіццё сусветнай індустрыі турызму ў сучасных умовах глабалізацыі. Транснацыяналізацыя сусветнай індустрыі турызму. Новыя віды турызму. Інавацыі ў развіцці індустрыі турызму.

Метады вывучэння міжнародных турыстычных патокаў, крыніцы статыстычных даных. Сучасныя асаблівасці міжнародных турыстычных патокаў. Сегментацыя сусветнага турыстычнага рынку. Схема раяніравання сусветнай турыстычнай прасторы UNWTO. Методыка комплекснага эканоміка-геаграфічнага аналізу турыстычнага рэгіёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Геаграфія міжнароднага турызму

*Тэма 4. Геаграфія турызму краін Еўропы*

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу Еўропы. Краіны-лідары сусветнага турызму ў рэгіёне. Францыя, Іспанія, Італія, турыстычныя рэсурсы ў краінах рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты. Лондан, Парыж, Рым, Крыт (Грэцыя), Барселона (Іспанія). Папулярныя віды турызму ў краінах рэгіёна. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёна. Перспектывы развіцця турызму ў еўрапейскім рэгіёне. Пагрозы страты дамінуючага становішча Еўропы на рынку міжнароднага турызму.

Развіццё турызму на тэрыторыі Беларусі: асаблівасці рэкрэацыйна-геаграфічнага становішча, прыродныя і гісторыка-культурныя рэсурсы развіцця турызму, турыстычная інфраструктура. Асаблівасці арганізацыі асноўных відаў турызму ў краіне. Праблемы развіцця турызму.

*Тэма 5. Геаграфія турызму краін Азіі*

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу Азіі. Краіны-лідары сусветнага турызму ў рэгіёнах. Кітай, Тайланд, Малайзія. Турыстычныя рэсурсы ў вывучаемых рэгіёнах. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты. Балі (Інданезія), Пхукет (Тайланд), Катманду (Непал), Гоа (Індыя). Папулярныя віды турызму ў краінах рэгіёна. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў. Перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

*Тэма 6. Геаграфія турызму краін Афрыкі*

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу Афрыканскага рэгіёна. Краіны-лідары сусветнага турызму ў рэгіёне. Марока, Егіпет, Туніс. Турыстычныя рэсурсы ў краінах рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты. Мерзуга (Марока), Кейптаўн (Паўднёвая Афрыка), Аруша (Танзанія). Папулярныя віды турызму ў краінах рэгіёна. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці. Турыстычныя фармальнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёна. Праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне. Лакальныя канфлікты і войны.

*Тэма 7. Геаграфія турызму краін Амерыкі*

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу Паўночнай і Лацінскай Амерыкі. Краіны-лідары сусветнага турызму ў рэгіёне. ЗША, Мексіка, Канада. Турыстычныя рэсурсы ў краінах рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты. Астравы Карыбскага басейна, Мексіканскі заліў. Папулярныя віды турызму ў краінах рэгіёна. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёна. Спецыфіка і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

*Тэма 8. Геаграфія турызму рэгіёна Аўстраліі і Акіяніі*

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу рэгіёна Аўстраліі і Акіяніі. Турыстычныя рэсурсы ў вывучаемых рэгіёнах. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты. Квінстаўн (Новая Зеландыя), Мельбурн (Аўстралія), Бора-Бора (Французская Палінезія). Папулярныя віды турызму ў краінах рэгіёна. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў. Перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне. Цяжкадаступнасць краін для турыстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | | выбарачнае апытанне |
| **Раздзел I. Тэарэтычныя і метадалагічныя асновы геаграфіі турызму** | | | | | |
| 2. | Класіфікацыя відаў і форм турызму і фактары іх развіцця | 2 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 3. | Геаграфія міжнародных турыстычных патокаў і метады іх вывучэння. Структура сусветнага турыстычнага рынку | 4 | 4 | | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| **Раздзел II. Геаграфія міжнароднага турызму** | | | | | |
| 4. | Геаграфія турызму краін Еўропы | 10 | 6 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-прэзентацыя |
| 5. | Геаграфія турызму краін Азіі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-прэзентацыя |
| 6. | Геаграфія турызму краін Афрыкі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-прэзентацыя |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 7. | Геаграфія турызму краін Амерыкі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-прэзентацыя |
| 8. | Геаграфія турызму рэгіёна Аўстраліі і Акіяніі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя-прэзентацыя |
| | **Разам…** | **32** | **20** | **12** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Александрова, А. Ю.* Международный туризм : учебник / А. Ю. Александрова. – 2-е изд. перераб. и доп. – М. : КНОРУС, 2010. – 464 с.

2. *Воскресенский, В. Ю.* Международный туризм : учеб. пособие / В. Ю. Воскресенский. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юнити-Дана, 2015. – 462 с.

3. География международного туризма. Зарубежные страны : учеб. пособие для студентов по специальности «менеджмент» (специализации «менеджмент в сфере междунар. туризма») / авт.-сост.: Л. М. Гайдукевич [и др.]. – Минск : Аверсэв, 2003. – 301, [1] с.

4. География международного туризма. Страны СНГ и Балтии : учеб. пособие для студентов вузов по специальности «менеджмент» (специализации «менеджмент в сфере междунар. туризма») / авт.-сост.: Л. М. Гайдукевич [и др.]. – Минск : Аверсэв, 2004. – 250, [2] с. – (Учебник высшей школы).

5. География туризма : учебник / А. Ю. Александрова [и др.] ; под ред. А. Ю. Александровой. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : КНОРУС, 2009. – 592 с.

6. *Погодина, В. Л.* География туризма : учебник для студентов вузов, обучающихся по направлению подготовки «менеджмент» (специальности «экономика и управление на предприятии туризма») / В. Л. Погодина, И. Г. Филиппова ; под ред. Е. И. Богданова. – М. : ИНФРА-М, 2015. – 255 с.

7. *Рындач, М. А.* Основы туризма : учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по направлению подготовки «туризм» / М. А. Рындач ; под ред. С. Н. Смоленского. – М. : Дашков и К* ; Ростов н/Д : Наука-Спектр, 2015. – 204 с.

8. *Сенин, В. С.* Организация международного туризма: учебник / В. С. Сенин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Финансы и статистика, 2005. – 400 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1.* Всемирная Туристская Организация UNWTO [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unwto.org. – Дата доступа: 11.01.2016.

*2. Квартальнов, В. А.* Теория и практика туризма : учебник / В. А. Квартальнов. – М. : Финансы и статистика, 2003. – 672 с.

*3. Мечковская, О. А.* География туризма. Методы анализа туристского пространства : пособие для студентов географического факультета / О. А. Мечковская. – Минск : БГУ, 2008. – 113, [2] с.

*4.* О развитии туризма, деятельности туристических организаций, коллективных средств размещения Республики Беларусь в 2016 году / Нац. стат. ком. Респ. Беларусь. – Минск : Нац. стат. ком. Респ. Беларусь, 2017. – 32 с.

*5. Сапожникова, Е. Н.* Страноведение: Теория и методика туристского изучения стран : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / Е. Н. Сапожникова. – 2-е изд., испр. – М. : Академия, 2004. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– мультымедыя-прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліку.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя-прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку і інш.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліку.

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Геаграфія турызму» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладны пералік тэм кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

### Тэма 1. Віды і формы турызму і фактары іх развіцця

1. Гісторыя ўзнікнення і развіцця падарожжаў і турызму.
2. Фактары, якія ўплываюць на развіццё міжнароднага турызму.
3. Асноўныя віды і формы міжнароднага турызму.
4. Класіфікацыйныя прыкметы турызму і іх характарыстыка.
5. Характарыстыка міжнароднага турыстычнага рынку, яго стан і перспектывы.

### Тэма 2. Геаграфія турызму краін Еўропы

1. Сучасны стан развіцця турызму ў краінах Еўропы.
2. Краіны-лідары сусветнага турызму рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты.
3. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці краін рэгіёна.
4. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў.
5. Асноўныя праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

### Тэма 3. Геаграфія турызму краін Азіі

1. Сучасны стан развіцця турызму ў краінах Азіі.
2. Краіны-лідары сусветнага турызму рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты.
3. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці краін рэгіёна.
4. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў.
5. Асноўныя праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

### Тэма 4. Геаграфія турызму краін Афрыкі

1. Сучасны стан развіцця турызму ў краінах Афрыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Краіны-лідары сусветнага турызму рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты.

3. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці краін рэгіёна.

4. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў.

5. Асноўныя праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

## Тэма 5. Геаграфія турызму краін Амерыкі

1. Сучасны стан развіцця турызму ў краінах Амерыкі.

2. Краіны-лідары сусветнага турызму рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты.

3. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці краін рэгіёна.

4. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёнаў.

5. Асноўныя праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

## Тэма 6. Геаграфія турызму рэгіёна Аўстраліі і Акіяніі

1. Сучасны стан развіцця турызму ў Аўстраліі і Акіяніі.

2. Краіны-лідары сусветнага турызму рэгіёна. Асноўныя турыстычныя цэнтры, курорты.

3. Турыстычная інфраструктура, ступень рэкрэацыйнай засвоенасці краін рэгіёна.

4. Турыстычныя фармальнасці і ўмовы ўезду ў краіны рэгіёна.

5. Асноўныя праблемы і перспектывы развіцця турызму ў рэгіёне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГЕАГРАФІЯ ТУРЫЗМУ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(культурная спадчына і турызм)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,46. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ